ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 96 | СЕРАДА, 26 КРАСАВІКА 1933 г. | № 96

ПРАФСАЮЗЫ, АРГАНІЗУЙЦЕ ПЕРАМОГУ НА ГАРОДНІХ ПАЛЁХ!

Стварэньне ўласнай харчовай базы ў суме мерапрыемстваў па палепшаньні рабочага снабжэньня мае выключнае значэньне. Сёлета ў сувязі з гэтым прафсаюзам, перад якімі партыя паставіла цэнтральнай задачай далейшае палепшаньне матар'яльных і культурна-бытавых умоў рабочых, прадстаіць вытрымаць сур'ёзны экзамін—па-бальшавіцку арганізаваць і правесьці гароднюю сяўбу. Гародняя сяўба, асабліва ў гэтым годзе, калі большасьць асноўных прадпрыемстваў маюць прыгарадныя гаспадаркі з іх невычарпальнымі магчымасьцямі, павінна быць у цэнтры ўвагі ўсіх прафсаюзных арганізацый. Ці маем мы такое становішча ў нас на Віцебшчыне? Як правільна адзначыла газэта „Рабочий",—прафсаюзныя арганізацыі Віцебшчыны падмянілі барацьбу за ўзорнае правядзеньне сяўбы ў калгасах славесна дэклярацыйным „кіраўніцтвам", і гэта прывяло да таго, што падрыхтоўка да сяўбы ў прыгарадных гаспадарках апынулася пад пагрозай зрыву. Асабліва недапушчальна ў гэтым роля гарпрафсавету, які нягледзячы на неаднаразовыя сыгналы друку і наліччa яўнай пагрозы, ня ўзяўся за баявую работу па мабілізацыі прафактыву і ўсіх рабочых на бальшавіцкае змаганьне за сапраўдную арганізацыю сяўбы на гародніх палёх.

Рад прафарганізацый не заняліся гароднай сяўбой і зараз, пасьля сыгналаў друку, пасьля пастановы пленуму ЦСПСБ, які паставіў перад прафсаюзамі Беларусі ў якасьці важнейшай, на даным і на наступных этапах, задачай пераключыцца на барацьбу за высокі ўраджай у прыгарадных гаспадарках. Мы, нажаль, сустракаемся яшчэ з такой катэгорыяй прафработнікаў, якія лічаць, што гародняя сяўба—справа ўсіх, акрамя прафсаюзаў. Мы, нажаль, маем яшчэ такія фабзавмясцкомы, якія забылі, што арганізацыя сяўбы—важнейшы канкрэтны вучастак прафсаюзных арганізацый, што рэзалюцыямі гароднай сяўбы не правядзеш, што ў даным выпадку патрабуюцца не дэклярацыі, а канкрэтныя дзеі. І тым горш для ФЗМК ганчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін і фабрыкі „Дзьвіна", якія паказалі сваю нездольнасьць ажыцьцявіць важнейшую дырэктыву партыі, нездольны змагацца за генэральную лінію партыі. Тым горш для фабкому «Сьцягу», каапгас якога абавязаны да 27-га красавіка закончыць пасеў аўсу, толькі 24-га пачаў ворыва. Іменна так стаіць пытаньне, бо партыя судзіць аб рабоце той ці іншай прафсаюзнай арганізацыі не па колькасьці вынесеных рэзалюцый, а па жывых справах, па іх рэзультатах, бясспрэчна і па частцы палепшаньня матар'яльна - бытавых умоў рабочых.

Які практычны вывад павінны зрабіць для сябе прафсаюзныя арганізацыі зараз, калі мы ўступілі ў масавую сяўбу?

Неадкладна пераключыцца на бальшавіцкую барацьбу за перамогу на гародніх палёх. Не на словах, а на справе мабілізаваць усе сілы на выкананьне пасеўных плянаў у максымальна скарочаны тэрмін—вось які практычны вывад павінна зрабіць для сябе кожная прафарганізацыя, якая мае справу з прыгараднай гаспадаркай. Што патрабуецца для таго, каб арганізаваць перамогу на гародніх палёх? Канкрэтнае і штодзённае кіраўніцтва і дапамога, баявая бальшавіцкая работа па ліквідацыі дапушчаных памылак. І менш усяго агульных разважаньняў і гучных рэзалюцый! Трэба памятаць, што справа палепшэньня рабочага снабжэньня рашаецца зараз на гародах. Пагэтаму больш унікаць у жыцьцё каапгасаў, умець на-ходу выпраўляць недахопы, папярэджваць прарывы. Узьняць шырокую хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, выклікаць магутны творчы ўздым на барацьбу за высокаякаснае правядзеньне гароднай сяўбы, перабудаваць работу рабочкомаў, падпарадкаваўшы яе задачам барацьбы за высокі ўраджай, разгарнуць вялікую палітычна-масавую работу сярод рабочых каапгасаў пад кутом гледжаньня іх ролі і адказнасьці ў справе правядзеньня сяўбы 1933 году—першага году другой пяцігодкі—канкрэтная праграма работы кожнага фабзавмясцкому на фронце гароднай сяўбы. Неабходна мабілізаваць усіх добрасумленных рабочых на бязьлітасную барацьбу супроць кулацка-шкодніцкіх элементаў і іх саюзьнікаў: лодыраў, прагульшчыкаў, лятуноў, вароў, ачысьціць каапгасы ад чуждага элементу—баявая задача дня.

Правядзеньне сяўбы ў прыгарадных гаспадарках—справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Давесьці да сьвядомасьці кожнага рабочага, што яго асабісты ўдзел у барацьбе за высокі ўраджай—неабходная ўмова посьпеху, мабілізаваць рабочых на арганізаваную адпрацоўку поўнай колькасьці працадзён на гародах, унікаючы бяссыстэмнасьці, якая мела месца ў мінулым годзе, зараз-жа распляначаць удзел рабочых у сумесным змаганьні за выкананьне плянаў пасеву і ўборкі, зразумела на добраахвотных пачатках—вось, што патрабуецца ад кожнага ФЗМК, прадпрыемства, якое мае прыгарадную гаспадарку.

Наладзіць шэфства лепшых ударных брыгад прадпрыемстваў над брыгадамі каапгасаў, перанесьці ў прыгарадную гаспадарку вопыт арганізацыі працы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, дапамагчы ўмацаваць брыгаду, як асноўнае зьвяно арганізацыі працы ў прыгарадных гаспадарках—гэтыя пытаньні павінны быць у цэнтры ўвагі фабзавмясцкомаў.

Пастаноўка культмасавай работы ва многіх каапгасах пакідае жадаць шмат лепшага. Культсэктары фабзавмясцкомаў павінны ўзяцца, нарэшце, за гэты канкрэтны вучастак, памятаючы, што яны адказваюць за арганізацыю культмасавай работы і ў каапгасах. Хіба дапушчальна такое становішча, калі гурткі па ліквідацыі няпісьменнасьці ў радзе прыгарадных гаспадарак не работаюць, калі чырвоныя куткі служаць складачным памяшканьнем? Вось дзе шырокае поле дзейнасьці для культсэктароў ФЗМК!

Усім гэтым, вядома, ня вычэрпваецца комплекс канкрэтных задач, што стаяць перад прафарганізацыямі прадпрыемстваў у барацьбе за высокі ўраджай на гародах. Трэба памятаць адно: каапгас—цэх прадпрыемства, адзін з важнейшых вучасткаў работы прафсаюзных арганізацый. Арганізаваць сапраўдную барацьбу за пасьпяховае выкананьне плану гэтага цэху на высокім палітычным узроўні, навярстаць упушчанае, выпраўляючы на-ходу дапушчаныя памылкі, заваяваць пяршынства ва ўсесаюзным конкурсе прыгарадных гаспадарак—першачарговая задача фабзавмясцкомаў і рабочкомаў каапгасаў. Усе сілы і сродкі павінны быць мабілізаваны на пераможнае ажыцьцяўленьне гэтых задач.

Гарпрафсавет і ўся прафсаюзная маса павінны неадкладна ўзяцца за арганізацыю перамогі на гародных палёх, мабілізуючыся на выкананьне дырэктыў партыі і вышэйшых прафорганаў аб стварэньні ўласнай харчовай базы. ФЗМК і прафактыў павінны ўзначаліць барацьбу за ўзорнае правядзеньне сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

Аб працы ўпаўнаважаных у сельсаветах у дні першамайскіх сьвят.

ПАСТАНОВА ГАРКОМУ КП(б)Б АД 25 КРАСАВІКА.

У сувязі з паступіўшымі заявамі ад некаторых таварышоў аб дазволе выехаць у горад на час сьвята 1-га мая гарком КП(б)Б пастанаўляе:

Катэгарычна забараніць усім упаўнаважаным гаркому і гарсавету, усім брыгадзірам гарадзкіх арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў выехаць на першамайскія сьвяты ў горад абавязаўшы іх удзельнічаць у правядзеньні сьвята ў сельсаветах і калгасах.

Сэкратар гаркому КП(б)Б С. Міцькоў.

ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў СПАБОРНІЦТВЕ ТРОХ РАЁНАЎ.

МЫ АДСТАЕМ У ВОРЫВЕ І СЯЎБЕ. СПАБОРНІЧАЮЧЫЯ З НАМІ МЕНСКІ І ГОМЕЛЬСКІ РАЁНЫ ПАЙШЛІ ДАЛЁКА ЎПЕРАД ЗА НАС.

Да 25 красавіка ў Бабініцкім, Даўжанскім, Рудніцкім, Рудакоўскім, Замастоцкім і Мікалаеўскім сельсаветах не распачалі сяўбы аўсу.

ХОД СЯЎБЫ ПА РАЁНЕ НА 25 КРАСАВІКА.

Заданьне ЦК І СНК пасеяць аўсу 6000 га.

Пасеяна да 25-га 71,16 га.

Да гэтага тэрміну ніводнага га аўсу не засеяна калгасамі і аднаасобнікамі Рудніцкага, Рудакоўскага, Замастоцкага, Мікалаеўскага сельсаветаў. У Даўжанскім сельсавеце засеяна толькі 0,36 га, у Бабініцкім—0,75 га. ТЭМПЫ ГАНЕБНЫЯ. З першых жа дзён сяўбы мы ганебна адсталі ад Менскага і Гомельскага раёнаў, з якімі мы спаборнічаем.

ПАСЕЎ ЯЧМЕНЮ зусім не пачалі ў Бабініцкім, В.-Лётчанскім, Даўжанскім, Рудніцкім, Старасельскім, Машканскім і Замастоцкім сельсаветах.

ПАСЕЎ ІЛЬНУ зусім не распачат у Старасельскім, Машканскім, Віцебскім, Рудакоўскім, Бабініцкім і Замастоцкім сельсаветах.

Да 25 красавіка фактычна не разгорнут ПАДСЕЎ КАНЮШЫНЫ. Паказальнікі ганебныя. З 3000 га плянавых засеяна толькі 521,08 га па калгасах і 1,1 га па аднаасобным сэктары.

Зараз наступілі дні, калі ўжо нельга гаварыць аб дрэнным надвор'і. Віцебшчына мае ўсе ўмовы для пасьпяховага правядзеньня сяўбы. І ганебнае адставаньне зьяўляецца толькі рэзультатам апартуністычнага самацёку, нескарыстаньня ўсіх умоў, якіх ня мае большасьць раёнаў БССР.

Партыя і ўрад управе ад нас—пралетарскага цэнтру — патрабаваць ударнага правядзеньня сяўбы. Аб наліччы глыбокага прарыву час ужо ўцяміць кіраўнікам тых сельсаветаў, дзе да гэтага часу нават не распачалі сяўбу.

Калгасным масам трэба растлумачыць, што „веснавы дзень год кормі", што ЗАРАЗ ДНІ ІГАДЗІНЫ РАШАЮЦЬ СПРАВУ.

ЗРЫЎШЧЫКАЎ ПАСЕВУ АЎСУ—ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

НІ НА АДЗІН ДЗЕНЬ НЕЦЯРПІМА ЗАСТАЎЛЕНЬНЕ НА ЧАЛЕ гарЗА ЗЕМСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ.

Братэрская РСФСР аказала дапамогу нашаму раёну—дала 3.000 цэнтнэраў насеньня аўсу. У перадавым артыкуле «Віцебскі пралетары» ад 16 красавіка пісаў як нездбайна адносіліся гарЗА і сельсаветы да рэалізацыі гэтай дапамогі, да абмену насеньня аўсу Сёньня мы прымушаны заявіць, што абмен сарваны.

Некалькі даведак.

ДАВЕДКА № 1.

Па становішчы на 22 красавіка абменена 1542 цэнтн., альбо 51,4 проц. пляну пры недахопе насеньня аўсу ў 230,5 цэнтн, ня ўключаючы ў гэтую колькасьць недахопу аўсу да вікі і страхавога фонду.

ДАВЕДКА № 2.

Калгасы Рудакоўскага сельсавету павінны былі абмяняць 420 цэнтн., абмянялі толькі 54. Недахоп насеньня аўсу складае па гэтым сельсавеце 142 цэнтн., акрамя недахопу аўсу да вікі і страхфондаў. Маецца лішкаў ячменю 113 цэнтн. ГарЗА не прыцягнуў да адказнасьці кіраўнікоў калгасаў і сельсавету.

ДАВЕДКА № 3.

Замастоцкі сельсавет павінен быў абмяняць 130 цэнтн., абмяняў 71. „Очковтиратель" Колатаў заявіў, што для калгасаў Замасточча авёс непатрэбны, у той час як не хапае 49 цэнтн насеньня аўсу плюс недахоп аўсу да вікі і страхфонду. Апартуністы з гарЗА заспакоіліся завярэньнямі свайго сабрата па апартунізьме

ДАВЕДКА № 4.

Калгасы Машканскага сельсавету з 140 цэн. не абмянялі ніводнага кілёграму. Пры ўмовах поўнага абмену гэтая колькасьць далёка не забясьпечвае патрэбнасьці ў насеньні аўсу.

Машканскія апартуністы, спасылаючыся на дрэнную дарогу, авёс не абменьваюць. ГарЗА маўчаў, ня прымусіў машканцаў знайсьці шляхі дастаўкі, зрабіць абмен аўсу.

Ня лепш справа і па Сялюцкім, Мікалаеўскім і іншых сельсаветах.

Гэта не выпадкова. Наступны дакумант паказвае, як аднесьліся ў нашым раёне да забесьпячэньня пасеўплошчы насеньнем аўсу, як апартуністычна аднесьліся да выкананьня дырэктывы партыі і ўраду.

Атрымана наступная тэлеграма.

„Віцебск райком партыі, райвыканкому.

НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА НАЯЎНАСЬЦЬ У ВАШЫМ РАЁНЕ БАЗЫ АЎСУ, ВЫ НЯ ВЫКАНАЛІ ПЛЯНУ АБМЕНУ, АБМЯНЯЎШЫ ТОЛЬКІ 37 ПРОЦ., СТВАРАЮЧЫ ГЭТЫМ ПАГРОЗУ СВАЕЧАСОВАГА ПАСЕВУ АЎСУ. У СУВЯЗІ З РАШЭНЬНЕМ ЦК ПАЧАЦЬ МАСАВУЮ СЯЎБУ АЎСУ ДВАЦЦАТАГА. ЦК І СНК ПАТРАБУЮЦЬ У ДВУХДЗЁННЫ ТЭРМІН СКОНЧЫЦЬ АБМЕН. КІРАЎНІЦТВА АБМЕНАМ УСКЛАДАЕМ ПЭРСАНАЛЬНА РАЙКОМ ПАРТЫІ І РАЙВЫКАНКОМ! ВЫКАНАНЬНЕ ТЭЛЕГРАФЦЕ ЦЭНТРАПАСЯЎКОМУ ШАСНАЦЦАТАГА. ГІКАЛО, ГАЛАДЗЕД".

Старшыня гарсавету Бардашэнка, атрымаўшы дырэктыву ЦК і СНК, даў намесьніку загадчыка гарЗА т. Паўленка загад, чамусьці павялічыўшы тэрмін на адзін дзень:

„Тав. Паўленка. На працягу 3-х дзён прапаную скончыць абмен, узьдзейнічаючы канкрэтна на калгасы і інш. Кардашэнка. 14|IV".

Намесьнік заг. гарЗА Паўленка знайшоў меншага за сябе Ён накладвае рэзалюцыю:

„Т. Піскунову.

Да выкананьня. Паўленка. 14|IV"

А загадчык сэктарам вучоту гарЗА т. Піскуноў, правільна лічачы, што яго справа займацца вучотам, што ён па сваім службовым становішчы ня можа „канкрэтна ўзьдзейнічаць на калгасы і інш." паклаў тэлеграму ў папку. На гэтым і скончылася выкананьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду, а авёс і на сёньняшні дзень застаецца ляжаць у складах. Вось узор апартуністычных адносін да выкананьня важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Пэрсанальнае кіраўніцтва абменам пераўскладзена на... статыстыка Цяпер будзе зразумела чаму авёс абменены толькі на 51,4 проц.

Мы ў перадавым артыкуле ад 18 га красавіка не двухсэнсова паставілі пытаньне, што Брыкаў і Паўленка ня могуць больш ніводнага дня заставацца на чале гарЗА. Нас зьдзіўляе, чаму да гэтага часу ніякіх захадаў ня прынята. Мы спадзяемся, што гарком КП(б)Б і гарсавет у бліжэйшыя два—тры дні вырашаць пытаньне аб кіраўніках гарЗА. Кіраўніцтва гарЗА павінна быць, нарэшце, зьменена.

Заданьне сяўбы аўсу будзе выканана.

ШУМНЯНЫ (ад нашага спэцкора).

Камуна «Іскра ленінская» абавязалася да 25 красавіка ў абавязковым парадку засеяць 26 га аўсу, вызначаныя плянам сельсавету. Адначасова засеяць іншых культур (ячменю і ільну) 10 га. 17 красавіка адбыўся масавы выхад усіх камунараў на ворыва.

Р. В.

Калгас „Заходняя Дзьвіна" марудзіць з сяўбой.

(Ад нашага карэспандэнта).

Сяўба аўсу ў калгасе «Заходняя Дзьвіна», В.-Лётчанскага сельсавету, ідзе марудными тэмпамі. На 23 красавіка засеяна толькі 3 га. Праўленьне каапгасу як належыць не пераключылася на правядзеньне веснавой сяўбы Праўленьне калгасу ня ўцяміла таго, што ад яго партыя і ўрад патрабуюць выкананьня сяўбы ў вызначаны тэрмін.

Гэткае становішча зусім нецярпіма, бо ў калгасе «Заходняя Дзьвіна» маюцца спрыяючыя ўмовы для разгортваньня масавай сяўбы. Партыйнай ячэйцы патрэбна зьвярнуць асаблівую ўвагу на кіраўніцтва калгасу „Заходняя Дзьвіна".

Р. Васільлеў.

Неадкладна трэба набыць сявярку.

(Ад нашага спэцкора)

Аб неабходнасьці набыцьця сявяркі шмат гаварылі ў калгасе імя Будзёнага, Шумнянскага сельсавету, нават вылучылі грошы для набыцьця сявяркі. Да пачатку масавай сяўбы засталіся літаральна лічаныя дні, а сявярка яшчэ не набыта.

Старшыня калгасу Пляшкоў знайшоў «аб'ектыўныя» прычыны ў апраўданьне ігнараваньня сявяркі—дрэнны шлях. Праўленьне калгасу павінна прымусіць кір ўнікоў неадкладна набыць сявярку, каб поўнасьцю выканаць плян радавога пасеву.

Вярхоўскі.

Тады, калі аднаасобнікаў скідваюць з рахунку...

МАШКАНЫ. (Ад нашага спэцкора).

«Дрэнна абстаіць у нас справа з аднаасобнікамі, дрэнна яны рыхтуюцца да сяўбы»,—разважаюць старшыня і статыстык Машканскага сельсавету.

Зусім правільна—супроць фактаў ня пойдзеш. Аднаасобнікі Машканскага сельсавету зусім дрэнна рыхтуюцца да сяўбы, нягледзячы на тое, што калгасы сельсавету распачалі ворыва.

Па аднаасобным сэктары пасеўпляны даведзены на 11 красавіка да 181 гаспадаркі. Адмовіліся ад пляну 26 гаспадарак.

Попелу па аднаасобным сэктары сабрана толькі 37,5 цэнтнэра.

Чым-жа тлумачыцца той факт, што аднаасобніві марудна рыхтуюцца да сяўбы? Гэта нельга інакш тлумачыць як тым, што сельсавет скінуў аднаасобнікаў з рахунку.

Машканскі сельсавет калектывізаваны, прыкладна, на 70—75 процантаў, але гэта не гаворыць аб тым, што сельсавет не павінен цікавіцца аднаасобным сэктарам. Ёсьць частка аднаасобнікаў, якая развраціласа і ўдарылася ў спэкуляцыю, але большая частка аднаасобнікаў дабывае свой хлеб добрасумленнай працай,—яны, бязумоўна, заўтрашнія калгасьнікі.

Выступленьне тав. Сталіна на першым усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў кіраўнікамі сельсавету (Данчанка, Казлоў) ігнаруецца, што сказваецца на справе.

Насеньне аднаасобнікаў не ачышчана, па сельсавеце працуе ўсяго адзін бракер. У сельсавеце нават няма вестак колькі ўжо ачышчана насеньня ў аднаасобнікаў, няма вучоту колькі не хапае насеньня. Усё разам узятае красамоўна гаворыць, што справа падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы аддана самацёку і апартуністычнаму благадушшу.

Ня толькі сельсавет ня кіруе і ня сочыць за падрыхтоўкай да сяўбы аднаасобнікаў, парт'ячэйка таксама не разгарнула належнай работы па пунктах. Хаця да асобных пунктаў прымацаваны актывісты, але іх работу ніхто не правярае і яны нічога ня робяць. Парт'ячэйка, таксама як і сельсавет, скінула з рахунку аднаасобнікаў, не паказаўшы сельсавету аб наяўнасьці апартуністычнага благадушша ў адносінах да аднаасобнага сэктару і сама пусьціла работу на самацёк.

Тав Сталін на першым усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў сказаў: «Аднаасобнікі ёсьць і іх нельга скідваць з рахунку таму, што яны зьяўляюцца нашымі заўтрашнімі калгасьнікамі». Гэтыя словы ясна падкрэсьліваюцца. У тым-жа Машканскім сельсавеце 40 лепшых аднаасобнікаў уступілі ў калгасы і добрасумленна адносяцца да працы.

Такое становішча і адносіны кіраўніцтва сельсавету да падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы нецярпімы. Парт'ячэйка і сельсавет павінны зразумець палітычную шкоднасьць ігнараваньня аднаасобніка, прыняць усе меры, каб падрыхтаваць яго да сяўбы.

Б. Зэліксон.

Члены сельсавету Вашчанка і Радчанка не займаюцца сяўбой.

ВІЦЕБСКІ сельсавет, 24. (Па тэлефоне).

У калгасе „Шлях да сацыялізму" ўзарана ворыва 8 га, забаранавана 3 га, засеяна канюшыны 1,5 га. Нягледзячы на ўсе магчымасьці—высокае сухое месца—калгас не распачаў сяўбы аўсу і іншых збожжавых культур, што тлумачыцца праваапартуністычнай базьню раньняй сяўбы, разважаньнямі: «яшчэ рана сеяць, пасьпеем».

У калгасе «Чырвоная армія» ўзарана 14 га. Рахункавод калгасу Хацкоўскі і брыгадзір Пятухоў не вядуць дакладнага ўліку ворыва. Прыкладна, даюць сельсавету зводку на 20-е, а потым зводку гэтую перапісваюць на 22 красавіка.

У калгасе «Іскра» ворыва ідзе нездавальняюча. Узарана 41 га. У калгасе не хапае цягавай сілы. МТС у хуткім часе павінна перакінуць у калгасе «Іскра» трактар, інакш ворыва зацягнецца. У калгасе засеяна канюшыны 16 га, капусты—0,14 га, буракоў—0,29 га.

Член сельсавету вёскі «Давыдаўка» Вашчанка бязьдзейнічае, не вядзе ніякай работы сярод аднаасобнікаў сваёй вёскі, каб распачаць сяўбу.

Аднаасобнікі вёскі Аўселева ўзаралі 1,5 га, вёскі Брак—24 га, Чэпіна—3 га. Вёскі Шаршні 1-я і 2-я і Броды яшчэ не разгарнулі ворыва Член сельсавету Радчанка бязьдзейнічае.

Буткевіч.

БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ПРЫВЯЛА ДА ЗРЫВУ.

Вялікае значэньне для пралетараў Віцебску ў справе палепшэньня грамадзкага харчаваньня мае раньняя гародніна. Прыходзіцца сказаць, што з-за апартуністычна-шкодных адносін да гэтай справы з боку кіраўнікоў калгасаў, каапгасаў, савгасаў і гарЗА закладка парнікоў, якія зьяўляюцца асноўным сродкам для атрыманьня раньняй гародніны, сарвана. На 23 красавіка па раёне выканана толькі 42,6 проц. пляну закладкі парнікоў.

Каапгасы, для якіх закладка парнікоў зьяўляецца адным з галоўнейшых зьвеньняў веснавой сяўбы, выканалі толькі 47 проц. пляну. Асноўныя пастаўшчыкі парніковай прадукцыі зьявіліся віноўнікамі ганебнага зрыву закладкі парнікоў па каапгасах.

Каапгас «Яноўка» (дырэктар Сідараў)—спэцыялізаваная парніковая гаспадарка, якая павінна была закласьці 8 тысяч рам, засеяла толькі 3.310 рам, альбо 41,3 проц. пляну; імя Парыскай камуны з 1.500 рам па пляне засеяла толькі 320 рам, альбо 21,3 проц; каапгас шчоткамбінату замест 300 рам па пляне засеяў 100 рам. Тут яскрава сказалася непаваротлівасьць кіраўнікоў каапгасаў, нездольнасьць іх арганізаваць работу так, каб у тэрмін выканаць заданьне партыі і ўраду. На першым туры галоўнага нашага бою, трыкутнікі ЦРК, ЗВК, шчоткамбінату, заводу «Чырвоны мэталіст» паказалі, што яны нездольны па бальшавіцку змагацца за палепшэньне рабочага снабжэньня, за стварэньне ўласнай харчовай базы. Толькі частка каапгасаў выканала свае заданьні па закладцы і засеве парнікоў: імя МОПР выканаў плян на 150 проц., «Новы шлях»—126 проц.

Савгасы выканалі агульны плян на 46 4 проц. Сарвалі закладку парнікоў: савгас „Падбярэзьзе" (дырэктар Пахомаў), які выканаў плян толькі на 29,8 проц., «Лужасна» (дырэктар Марозаў)—40 проц. і імя Дзяржынскага (дырэктар Гаўбоцкі)—54,6 проц.

Толькі апартуністычнымі адносінамі, толькі бязьдзейнасьцю дырэктароў Пахомава, Марозава і Гаўбоцкага можна тлумачыць факт зрыву закладкі парнікоў у той час, калі ў „Падбярэзьзі" і Лужасьне маецца па паўдзюжыне сваіх аграномаў. Там, дзе да справы падышлі з усёй бальшавіцкай сур'ёзнасьцю, плян закладкі парнікоў выканаць поўнасьцю. Савгасы: «Доўжа» і «Сасноўка» свае пляны выканалі на 100 процантаў.

Яшчэ горш справа абстаіць з закладкай парнікоў па калгасах. Калгасы раёну выканалі свой плян толькі на 31,7 проц., ні ў адным сельсавеце калгасы цалкам ня выканалі сваіх плянаў. У параўнаньні з калгасамі іншых сельсаветаў, больш-менш здавальняюча правялі закладку папрнікоў калгасы Старасельскага сельсавету (60 проц. пляну). Віцебскага (58,9 проц.) і Сялюцкага (58,9 проц.). Калгасы Машканскага сельсавету з 350 рам па пляне не закладалі ніводнай рамы. Ганебна мала зрабілі ў гэтым напрамку калгасы Рудніцкага сельсавету—(2,5 проц. пляну), Рудакоўскага (4,3 проц.), Замастоцкага (9,6 проц.), В.-Лётчанскага (11,6 проц.). Толькі нежаданьнем праўленьняў калгасаў займацца гэтай важнейшай справай, толькі бязьдзейнасьцю старшынь сельсаветаў, сэкратароў парт'ячэек можна тлумачыць факт зрыву закладкі парнікоў па калгасах раёну.

Гарпасяўком у сваёй пастанове ад 20 красавіка прапанаваў да 25 красавіка скончыць закладку і засеў парнікоў. Зрух маецца зусім нязначны. Вінаватыя ў зрыве закладкі парнікоў павінны быць прыцягнуты да суровай партыйнай і судовай адказнасьці.

Выкананьне пляну закладкі парнікоў па становішчы на 23 красавіка

(у штуках рам).

	План	Засеяна	Проц. выкан.
Усяго па раёне .	25732	10957	42,6
Па савгасах . .	2352	1094	46,4
Па каапгасах . .	12000	5648	47
Па калгасах . .	11380	4215	31,7

АГЛЯД ДРУКУ.

Аб трох задачах.

„Ударнік палеу“—насьценгазэта калгасу „Чырвоны Кастрычнік“, Машканскага сельсавету.

На сьцяне памяшканьня праўленьня калгасу вісіць насьценгазэта. Нумар насьценгазэты выпушчан 10 красавіка. У газэце—падагульненьне гатоўнасьці калгасу да сяўбы пасьля пробнага выезду.

Сёньня гэта ня можа задаволіць калгаснікаў. Зараз пісаць аб падрыхтоўцы да сяўбы,—значыць адставаць ад жыцьця. Зараз калгаснік жадае чытаць у сваёй насьценгазэце, як ідзе работа па падняцьці ворыва, жадае бачыць і чытаць аб лепшых ударніках і дрэнных прыкладах работы.

Але... насьценгазэта ня выходзіць ужо 9—10 дзён. У час веснавой сяўбы, калі ня толькі дораг кожны дзень, але калі трэба даражыць кожнай гадзінай і мінутай—насьценгазэта апусьціла рукі і гэтым самым адстае ад жыцьця. Газэта ня ведае тых, можна сказаць, адказнейшых момантаў у жыцьці калгасу. Міма яе праходзяць усе калгасныя справы адмоўнага і станоўчага боку.

Насьценгазэта «Ударнік палёў», як быццам, ня ведае (бо гэта нідзе ня бачна), што калгас пачаў ворыва, што ў брыгадзе «М. Рамшчына» калгаснікі Цітоў Ягор, Лабанаў Якуб, Шашкоў Сьцяпан ня выйшлі 16 красавіка на работу і парушылі статут. Міма газэты прайшло і тое, што прагульшчыкі аштрафаваны праўленьнем на пяць працадзён і папярэджаны, што калі такія выпадкі будуць працягвацца—яны будуць выключаны з калгасу. Атрымалі папярэджаньне і Лабецкая Проска і Загужынская Ганна за спазьненьне на работу. Здавалася-б, што газэта павінна была ўзьняць ярасьць усіх калгаснікаў супроць гэтых лодыраў, прагульшчыкаў.

Але газэта праходзіць міма..

Брыгада «М. Рамшчына»—адстаючая па калгасе. Безгаспадарчасьць і раскраданьне калгаснай маёмасьці стала там звычайным зьявішчам. Вось, 19 красавіка, уначы, з калгаснага склепу пакралі каля 15—20 пудоў бульбы. Рэдкалегія, як відаць, гэта не прыкмячае.

А ў брыгадзе «Левантова» Сіпараў Яўхім 16 красавіка, напіўшыся, загубіў калгаснага каня. Аб ім, як шкодніку калгаснага пагалоўя, газэта маўчыць.

Шмат яшчэ аб чым маўчыць газэта. У дні гарачай работы па падняцьці ворыва брыгада з брыгадай уступалі ў сацыялістычнае спаборніцтва. Брыгада «Левантова» спаборнічае з брыгадай «Машканы». Задарожная брыгада выклікала на сацспаборніцтва брыгады «М. Рамшчына» і «В. Рамшчына». Узьнялася ў калгасе вялікая, магутная хваля сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы першага году другой бальшавіцкай пяцігодкі. А газэта „Ударнік палёў“ не ўзначальвае спаборніцтва, не арганізоўвае масы на тое, каб выканаць умовы сацдагавору з калгасам імя Калініна.

Хіба нельга было вопыт перадавой Задарожнай брыгады, дзе брыгадзірам Сіпараў, перадаць адстаючай брыгадзе „М. Рамшчына“? Хіба нельга было ў газэце на чырвоную дошку заносіць лепшых ударнікаў, якія добрасумленна адносяцца да работы? Хіба нельга было арганізаваць селькораўскі рэйд па сьвінарніках з мэтай дабіцца палепшаньня догляду і гадоўлі сьвіней?

—Усё гэта можна зрабіць,—скажа напэўна член рэдкалегіі тав. Бондараў. Так яно і ёсьць. Газэта «Ударнік палёў» здольна весьці апэрацыйную і масавую работу. У балянсе яе работы ў мінулы час ёсьць рад каштоўных мерапрыемстваў, якія яна нядрэнна правяла. Газэта ўмела вяла работу па падрыхтоўцы да сяўбы.

Яшчэ 21 сакавіка газэта пісала:

> „На сёньняшні дзень прызначан пробны выезд у поле Усе калгаснікі ўсхваляваны, бо сёньня экзамін, бо сёньня праверка гатоўнасьці да бальшавіцкай сяўбы. Трэба ж не падкачаць! Трэба здаць экзамін-праверку на добра!

Яна паказвала, якія брыгады добра падрыхтаваліся і якія дрэнна.

Аднак, бяда ў тым, што газэта стала на поўшляху, не даводзіць справу да канца. А падрыхтоўка да сяўбы зьяўляецца аднэй толькі з умоў узорнага правядзеньня сяўбы. Газэта-ж пасьля праверкі гатоўнасьці калгасу да сяўбы маўчыць, нібы „набраўшы ў рот вады“. Яна забылася, што іменна ў час сяўбы трэба максымальна ўзьняць апэрацыйнасьць, бо „веснавы дзень год корміць“, таму сама газэта не павінна прагульваць. Газэта «Ударнік палёў», праўда, выкрывае шкодніцкае дзеяньне клясавага ворага, але яна яшчэ ня здолела выкрыць агентаў кулака —прагульшчыкаў, лодыраў, вароў.

29 сакавіка газэта адзначае:

> У нашым калгасе ёсьць складаная малатарня, якая каштуе некалькі тысяч. Але гэтая малатарня два гады як стаіць на тэрыторыі калгасу імя Калініна. У якім яна выглядзе старшыня калгасу ня ведае.

Аказваецца, што малатарня зараз зусім

> ня годна да працы, часьці яе заржавелі, бо ня былі змазаны. Дармна згінулі калгасныя грошы. У брыгадзе «Машканы» бульбакапалка цэлую зіму прастаяла пад адкрытым небам. Брыгадзір Цітоў П, не паклапаціўся ачысьціць яе ад гразі і паставіць пад крышу.

Газэта выкрыла гэты шкодніцкі факт адносін да сельгасмашын, але вінаватыя ў гэтым ня прыцягнуты да адказнасьці. Гэта ўзор таго, як праўленьне глуха адносіцца да сыгналаў газэты.

Але з гэтых прыкладаў ужо яскрава, што газэта «Ударнік палёў» можа пасьпяхова, улічыўшы свае памылкі, стаць баявым арганізатарам мас на ажыцьцяўленьне плянаў сяўбы. Для гэтага патрэбна ажыцьцявіць прынамсі тры практычныя задачы.

Па-першае:

Неабходна даўкамплектаваць склад рэдкалегіі лепшымі калгаснікамі, якія-б актыўна работалі ў рэдкалегіі, бо як гэта ні дзіўна, газэта ня мае нават адказнага рэдактара. Трэба абрацъ рэдактара, які б па-баявому расставіў сілы ў рэдкалегіі з тым, каб забясьпечыць штодзённы выпуск газэты ў час сяўбы непасрэдна на полі, арганізоўваючы выпуск брыгадных газэт. Бальшавіцкая апэрацыйнасьць—вось, што патрэбна газэце.

Па-другое:

Газэце «Ударнік палёў» патрэбна абрасьці актывам, бо яна ня мае селькораў. Вярней, у калгасе селькоры маюцца, але газэта імі ня кіруе. Рэдкалегія павінна ў бліжэйшыя дні ўзмацніць свае кіраўніцтва селькорамі, арганізоўваючы селькораўскія рэйды на палёх, у стайнях, сьвінарніках.

Па-трэцяе:

Яшчэ вышэй газэта павінна ўзьняць крытыку і самакрытыку.

„Ударнік палёў“ будзе тады апэрацыйным і магутным арганізатарам, калі яна будзе работаць з селькорамі, будзе ўзначальваць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, будзе вышэй узьнімаць крытыку і самакрытыку, накіраваную на ўзмацненьне калгаснай справы, на тое, каб зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі.

Адказ народнага камісара па замежных справах тав. М. М. Літвінава

на ліст спэцыяльнага карэспандэнта агенцтва „Рэйтар“ п. Флемінга і маскоўскага прадстаўніка агенцтва „Асошыэйтэд прэс“ п. Рычардсона.

Я атрымаў ваш ліст ад 20 гэтага месяца, у якім вы просіце мяне выказацца аб умовах, пакладзеных у аснову гандлёвых адносін з СССР, з прычыны, як вы пішаце, «становішча, узьнікшага ўсьлед за налажэньнем Вялікабрытаніяй фактычнага эмбарго на савецкі экспарт», а таксама «з прычыны памылковых уяўленьняў аб палітыцы СССР, якія могуць узьнікнуць у сувязі з замежным гандлем».

Мне здаецца, што паколькі з боку СССР за апошні час ня ўзьнікала ніякіх новых актаў ці распараджэньняў, якія закранаюць яе замежны гандаль, ваша пытаньне накіравана не па адрасе і што правільней было зьвярнуцца з ім да тэй краіны, дзеяньні якой прымусілі вас напісаць мне свой ліст. У адносінах да гэтай краіны было-б, здаецца, зусім законным і зразумелым пытаньне аб тым, ці вірэцца яна ў сваім замежным гандлі толькі гандлёвымі і эканамічнымі меркаваньнямі, ці таксама меркаваньнямі палітычнымі, паліцэйскімі, прэстыжнымі і інш.

Я, аднак, гатоў адказаць на ваша пытаньне адносна гандлёвай палітыкі СССР наогул. Наша замежная гандлёвая палітыка грунтуецца на непахісных асновах, якіх мы не мянялі з самага пачатку нашага замежнага гандлю і мяняць ня зьбіраемся. Прадпасылкамі гэтай палітыкі зьяўляюцца:

1. Эканамічная сувязь паміж краінамі сьвету, і ў асаблівасьці, паміж буйнейшымі з іх, незалежна ад існуючых у іх сацыяльна-палітычных сыстэм.

2. Выгада, якую мае кожная краіна ад яе гандлю з іншымі краінамі; давер'е да пакупцоў і прадаўцоў, заснаванае на аб'ектыўнай платаздольнасьці і даказанае на справе выкананьнем гандлёвых і фінансавых абавязацельстваў.

3. Адэкватнасьць палітычных патрасеньняў ва ўзаемаадносінах гандлюючых краін, як умова стабільнасьці гандлёвых адносін.

4. Свабода выкананьня афіцыяльнымі прадстаўнікамі гандлюючых краін неабходных фармальных функцый, зьвязаных з гандлем.

5. Законныя вносіны паміж прадстаўнікамі ўраду і грамадзянамі гандлюючых краін.

6. Надначаленьне чужаземцаў юрысдыкцыі краіны, у якой яны прабываюць.

Адсутнасьць ці парушэньне любой з гэтых умоў ямінуча ўскладняе і зьмяншае або робіць зусім немагчымым гандаль паміж двума краінамі.

Мы не дапускаем, каб гандаль аднэй дзяржавы з другімі выклікаўся іншымі меркаваньнямі, апрача ўласнай выгады, і дыктаваўся любоўю ці асаблівымі сымпатыямі да гэтай другой дзяржавы.

Савецкія заказы прымаліся і выконваліся таму, што адпаведныя камэрсанты і прамыслоўцы знаходзілі гэта выгадным для сябе. Цікавасьць да гэтых заказаў асабліва ўзмацнілася за апошнія гады крызісу і скарачэньня іншых рынкаў збыту. Роўным чынам нашы экспартныя тавары купляліся з меркаваньняў выгаднасьці цэн, якасьці, геаграфічнай блізасьці і г. д.

Асаблівая выгаднасьць гандлю з СССР заключаецца ў тым, што ў той час, як ён прывозіць сабе пераважна гатовыя вырабы (машыннае абсталяваньне) і поўфабрыкаты (мэталі), ён вывозіць амаль выключна сыравіну, абсалютна неабходную іншым краінам, а не прадметы раскошы, ужываньне якіх можна скарачаць, ці без якіх можна зусім абыйсьціся.

Другая асаблівасьць заключаецца ў тым, што мы прадаем сваю сыравіну не для накапленьня золата, ці дэвіз (валюты—Рэд.), а для пашырэньня і пакрыцьця нашага імпарту. Можна замяняць нашу сыравіну прадуктамі іншых краін, але і гэта не прывядзе да значнага павялічэньня імпарту гэтых краін. Эластычнасьць імпарту зьяўляецца выключнай асаблівасьцю Савецкага саюзу. Да гэтага трэба дадаць абэктыўную, даказаную на справе, платаздольнасьць нашай краіны, якая выцякае з вялізарных натуральных багацьцяў і крыніц сыравіны. Яе зусім нязначнай замежнай запазычанасьці і, нарэшце, з таго факту, што замежны гандаль СССР манапалізаваны, г. зн. знаходзіцца ў руках дзяржавы.

Гаворачы аб эластычнасьці нашага імпарту, трэба мець на ўвазе ня толькі магчымасьць вельмі вялікага расьцяжэньня, але і скарачэньня імпарту.

Наша зацікаўленасьць у імпарце з кожным годам зьмяншаецца. Мы зараз ужо можам без вялікай шкоды для тэмпаў нашага будаўніцтва скарачаць наш імпарт, і мы, натуральна, гэта робім і будзем рабіць па меры скарачэньня нашага экспарту. Мы ўпэўнены, што ў большым пройгрышы ад скарачэньня нашага імпарту застануцца тыя дзяржавы, якія прымусяць нас да гэтага, але гэта адаб'ецца таксама на ўсеагульным сусьветным крызісе.

З другога боку, пры адпаведных умовах мы маглі б павялічыць наш імпарт да такіх разьмераў, якія ня могуць не зрабіць уплыву на сусьветны крызіс. Не гаворачы ўжо аб заказах на машыны і абсталяваньне, якія маглі-б значна зьменшыць беспрацоўе, мы маглі-б у бліжэйшы час пры вядомых умовах сваімі заказамі скараціць сусьветныя запасы некаторых мэталяў на 30—40 і нават на 50 проц. Ёсьць тавары, сусьветныя запасы якіх маглі-б быць паглынены намі і на ўсе 100 проц.

Заўтра надыходзіць 15 гадавіна нашай манаполіі замежнага гандлю. Няма чаго гаварыць аб тым, што гэта сыстэма з нашага пункту погляду поўнасьцю сябе апраўдала. Мы ведаем, што гэта сыстэма зьяўляецца прадметам зайздрасьці з боку іншых дзяржаў. Некаторыя з іх нават прабавалі часткова ўводзіць яе ў сябе. Гэта сыстэма павінна быць прызнана, аднак, выгоднай таксама і для нашых контрагентаў. Каб прыйсьці да гэтага выводу, даволі падлічыць колькасьць банкрутстваў прыватных гандлёвых фірм, заводаў і банкаў у іншых краінах і суму страт. Пры распыленьні гандлю сярод мноства пакупцоў неабходна заўсёды ўлічваць пэўны процант рызыкі ад банкрутства, а ў годы крызісу гэты процант асабліва высокі, між тым, гэта рызыка зусім адсутнічае, калі прадаўцы маюць справу з адзіным пакупцом у асобе такой магутнай дзяржавы, як Савецкі саюз.

Манаполія замежнага гандлю адзін час выклікала заграніцай апасеньне скарыстаньня яе савецкім урадам у палітычных мэтах. Гэта апасеньне, аднак, ні на чым не абгрунтавана і на справе не апраўдалася. Савецкі ўрад вёў гандаль з прыяцельскімі, поўпрыяцельскімі і варожымі краінамі і нават з такімі, з якімі ён ня мае ніякіх афіцыйных зносін.

Але па прыродзе сваёй замежны гандаль патрабуе вядомых прававых рамак, адсутнасьць якіх адбіваецца на яго разьвіцьці. Гандаль, натуральна, больш разьвіваўся з тымі краінамі, якія дапамагалі стварэньню неабходных для гэтага ўмоў. Разьвіцьцё гандлю і стабільнасьць яго патрабуюць пэўнага спакою і адсутнасьці патрасеньняў.

Ня можа быць ні разьвіцьця гандлю, ні стабільнасьці, калі найменшыя палітычныя канфлікты паміж урадамі могуць у кожны момант спыніць гэты гандаль, і калі ўрады прысвойваюць сабе права вызваляць сваіх грамадзян, ці камэрцыйныя прадпрыемствы ад абавязацельстваў, прынятых імі на сябе па камэрцыйных згодах і дагаворах.

Падобныя мерапрыемствы наўрад ці зьяўляюцца належнай падрыхтоўкай да сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, якая ставіць сабе аднэй з задач—урэгуляваньне і нармалізацыю замежнага гандлю ў сусьветным маштабе.

Літвінаў.

Аб гандлёвых адносінах з Англіяй.

Загад наркома замежнага гандлю тав. Розэнгольца.

На падставе пастановы СНК СССР ад 20 кастрычніка 1930 г. „Аб эканамічных узаемаадносінах з краінамі, якія ўстанаўляюць абмежавальны парадак для гандлю з СССР, народны камісар замежнага гандлю т. Розэнгольц выдаў загад, які прадугледжвае наступныя меры ў адносінах гандлю з Англіяй:

1. Забарона замежна гандлёвым арганізацыям выдаваць у Англіі заказы і ўтвараць у гэтай краіне якія-б то ні было закупкі.

2. Забарона Саўфрахту фрахтаваць (наймаць) судны, якія плаваюць пад англійскім сьцягам.

3. Увядзеньне абмежавальных правіл для англійскіх грузаў, якія праходзяць транзітам праз СССР.

4. Максымальнае скарачэньне скарыстаньня англійскіх партоў і баз для транзітных і рээкспортных арганізацый Саюзу.

Меры гэтыя маюць моц на ўвесь час дзеяньня эмбарго (забароны). накладзенага 19 красавіка на ўвоз у Англію асноўных артыкулаў савецкага экспарту.

Жулікам і разлажыўшымся ня месца ў радах партыі.

Аздаравіць п'яны „актыў“.

Кіраўнікі-партыйцы трампарку, часабліва члены бюро, займаюцца сыстэматычнай п'янкай, што мае свой адбітак на працы. Так, 30 сакавіка ў гонар ад'езду Хадарэнка на вытворчую экскурсію, па яго ініцыятыве была наладжана п'янка ў камуніста Зупанчыка ў дварэ дэпо трамваю, на якой прысутнічалі сам Зупанчык, старэйшы брыгадзір дэпо трамваю, Яцэвіч — загадчык гаражу (член партыі), Сьмірноў, сэкратар ячэйкі дэпо трамваю, Рая —загадчык сталоўкі дэпо, Бляхарскі, былы сэкратар калектыву (зьняты за п'янку), зараз старэйшы агент па рабочым забесьпячэньні, і Хадарэнка—начальнік дэпо. Пачалі піць а 8 гадзіне ўвечары і скончылі а 4 гадзіне раніцы на другі дзень. У гэты дзень з дэпо выйшлі са спазьненьнем на лінію трамваі.

Аб гэтым ведаюць усе рабочыя трамваю, але-ж баяцца гаварыць, бо ўсё начальства. Аб тым, што ў трампарку зацісканецца самакрытыка, сьведчыць такі факт: тав. Віксон—член КП(б)Б з 1917 году на агульным сходзе выступіў і сказаў, што актыў займаецца п'янкай, то зараз з ім ніхто з кіраўнікоў ня гутарыць, стараняцца і абыходзяць яго. Другі факт, у сувязі з ад'ездам сэкратара калектыву на курсы п'яная кампанія рашыла высунуць сэкратаром замест Аўсеевіча кандыдатуру Хадарэнка—„свайго“ хлопца. Хадарэнка пасьпеў ужо за гэты час праваліць рад адказных работ, быў зьняты з работы начальніка руху і інш. работ. Ён таксама раней быў бюро гаркому камсамолу зьняты за апартунізм з камсамольскай працы. Калі на актыве было задана пытаньне, ці была п'янка, то члены бюро адказалі, што была, але ўсе сышліся выпадкова, выпілі па румачцы. На бюро калектыву актыў казаў, што гарэлку піць можна, але трэба ведаць, дзе і з кім. На гэтым актыве прысутнічаў член гаркому тав. Кофман, які лібэральна аднёсься да ўсёй справы і ня даў рашучага адпору п'яніцам і разлажыўшымся элемэнтам. Сэкратаром калектыву абралі тав. Хадарэнку.

Я лічу, што трэба аздаравіць п'яны „актыў“. Другога кіраўніка калектыву КП(б)Б павінен даць гарком. ГарКК павінен зацікавіцца ўсёй справай.

Вока.

Лякіраваны камуніст.

Некалькі часу таму назад агітмасавым аддзелам гаркому быў мабілізаваны для паездкі ў вёску па правядзеньні пасеўкампаніі сэкратар ячэйкі гартопу тав. Эмануэл. Апошні замест таго, каб паехаць для правядзеньня гэтай кампаніі, пашоў да ўрача, дастаў даведку аб тым, што ён хворы. Паміж іншым, сярод усіх работнікаў гартопу ён вёў такія размовы: „Я ў вёску не паеду, хоць-бы прышлося здаць усе свае членскія білеты“.

Гэты сэкратар ячэйкі замест таго, каб пайсьці на актыў паслухаць даклад тав. Гікало, без дазволу дырэкцыі працаваў другую зьмену, за што атрымаў 8 руб. Калі гэта было пастаўлена на бюро 10 красавіка, ён усе высунутыя абвінавачваньні супроць яго адмаўляў.

Брыгада, якая праверыла факты аб сыстэматычным водпуску дроў на 2 зьмену ўсім установам падцьвердзіла гэта, прычым працаваў Эмануэл ня больш як 4 гадзіны ў другую зьмену, а атрымліваў за 8 гадзін.

Партработа ў гартопе развалена. Сэкратар ячэйкі Эмануэл старшыні рабачкому т. Юдзелевічу ў працы не дапамагае, а наадварот, кампраматэе яго, лаючы яго ў прысутнасьці ўсіх работнікаў гартопу. Трэба адзначыць, што тав Юдзелевіч можа працаваць і зьяўляецца прыкладны камуністам.

Мы лічым, што маска з фальшывага камуніста Эмануэла, які прыкрываецца партыйным білетам, павінна быць сарвана. ГарКК павінна прыцягнуць яго да адказнасьці.

Скараходаў.
С. Багары.

Кармавыя дрожджы—на разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

(Ліст тэхніка).

Віцебскі дрожджазавод «Вызваленая праца» пачаў рабіць вопыты па атрыманьні кармавых дражджэй, упяршыню ў Савецкім саюзе праводзячы гэта ў завадзкім маштабе. Кармавыя дрожджы маюць вялізарнае значэньне, як кармавая база для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Першыя вопыты праводзіліся па схэме інстытуту прадзільнай і біа хімічнай прамысловасьці, але далі нязусім здавальняючыя вынікі: недастатковы выхад дражджэй ад пераапрацоўкі патакі (мелясы), слабая прэсоўка іх. Таму схэма атрыманьня кармавых дражджэй была зьменена. Пад кіраўніцтвам майстры заводу тав. Гольдбэрга, былі праведзены далейшыя вопыты, якія далі добрыя вынікі—пераход на падвоеную нагрузку квасільных чанаў і мажлівасьць нармальнай працы, не прыбягаючы да штучнага падагравання ў часе бражэньня ва ўсіх стадыях.

Кармавыя дрожджы, таксама як і пякарскія, вырабляюцца з адыходаў буракоў цукровай прамысловасьці—патакі (мелясы). Выхад кармавых дражджэй у час правядзеньня вопытаў на нашым заводзе даў 104 процанты пры пераапрацоўцы 3840 кілёграм мелясы, у той час, як выхад пякарскіх дражджэй дае толькі 70—80 процантаў гэтай колькасьці.

Ужываньне пякарскіх дражджэй у адкорме жывёлы і птушак праводзілася пад кіраўніцтвам прафэсара Леантовіча ў Масяве і прафэсара Дз'яканава ў Дзецкім сяле. Імі выяўлены станоўчы ўплыў пякарскіх дражджэй пры адкорме галоўным чынам сьвіней і куранят, але шырокае ўкараненьне ў жывёлагадоўлі і птушніцтве немагчыма, з прычыны высокай іх каштоўнасьці.

Кармавыя дрожджы па дэталёвым вывучэньні прафэсара Папова маюць у сваім складзе вялікую колькасьць бялку і вітамінаў. Яны значна танней пякарскіх дражджэй.

Далейшае правядзеньне вопытаў па атрыманьні кармавых дражджэй дасьць яшчэ большае абгрунтаваньне для стварэньня базы кармавых рэсурсаў для жывёлагадоўлі і птушніцтва савгасаў і калгасаў.

Тэхнік дрожджазаводу А. Кезулас.

АД РЭДАКЦЫІ. Мы чакаем паведамленьняў ад работнікаў дражджавога заводу аб далейшым пашырэньні іх вопытаў, а ад аб'яднаньня жывёлагадоўчых таварных фэрм—непасрэднага ўдзелу ў гэтай важнейшай справе.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ.

27 красавіка, а 6-й гадз. увечары, у вялікай залі гаркому КП(б)Б, склікаецца

АГУЛЬНАГАРАДЗКІ ЗЬЛЕТ РАБКОРАЎ І ЧЛЕНАЎ РЭДКАЛЕГІЙ ГАЗЭТ.

Гарком абавязвае сэкратароў парткалектываў і ячэек забясьпечыць пашырэнную работу сярод рабкораў і іх яўку на зьлёт.

Культпроп ГК КП(б)Б.

Сёньня, 26|IV, а 10 гадзіне ўвечары адбудзецца **ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁ-НАРАДА** пад старшынствам тав. ЛЯЎКОВА (ЦК КП(б)Б) ПА ПЫТАНЬНІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА 1-га МАЯ. З інфармацыйнымі дакладамі выступаюць старшыні першамайскіх камісій. Заключная прамова сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча. На нарадзе прымаюць удзел наступныя гарады і раёны: Жлобін, Рэчыца, Мсьціслаўль, Гарадок, Горкі, Заслаўль, Менск, Чачэрск.

28 красавіка, а 6 гадз. увечары, адбудзецца пашыраны

ГАРАДЗКІ КАМСАМОЛЬСКІ АКТЫЎ.

АБВЕСТКА ДНЮ:

1. Даклад сэкратара ЦК ЛКСМБ тав. ГЕРЦОВІЧА аб чарговых задачах камсамольскай арганізацыі.
2. Арг. пытаньні.

Мандаты на актыў атрымаць у гаркоме ЛКСМБ.

Гарком ЛКСМБ.

Зьлёт гарманістаў і зацейнікаў.

— Сёньня, 4 гадз. 30 мін. дню, у вялікай залі гаркому КП(б)Б склікаецца гарадзкі зьлёт гарманістаў, балалаечнікаў, зацейнікаў па пытаньні іх удзелу ў правядзеньні 1 мая і першамайскай дэманстрацыі.

Просьба да парткалектываў і ФЗМК да гэтага тэрміну выявіць паказаных таварышоў і забясьпечыць іх яўку на зьлёт. ГК КП б)Б.

— Сёньня, 26|IV, а 7-й гадзіне ўвечары, у габінэце сэкратара гаркому КП(б)Б адбудзецца нарада сэкратароў парт'ячэек і групортаргаў каапэрацыйных і гандлёвых арганізацый.

На нараду павінны зьявіцца сэкратары ячэек і групарторгі ЦРК, ТСТ, ЗВК, ЗМК, Белгандлю, Дорабкоопу, райспажыўсаюзу, Каацгандлю, Торгсін, райпрамсаюзаў, усіх ЗРК і яч. інвалідн. каапэрацыі.

— Сёньня, 26|IV, а 7 гадз. увеч., у памяшканьні клюбу трамвайшчыкаў адбудзецца пленум камунальнай сэкцыі гарсавету.

Яўка членаў і актывістаў сэкцыі абавязкова ў сувязі з важнасьцю пытаньня.

— 26 і 27 красавіка, у памяшканьні Дому камасьветы адбудзецца вучоба камсамольскага кіруючага актыву гораду па нацпытаньні. Дакладчыкі тт. Рабіновіч, Рубінчык, Бжозэ. На вучобу павінен зьявіцца ўвесь актыў ад сэкратара калектыву КСМ да групорга. Яўка пад адказнасьць сэкратароў.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ РАСІЙСКАЙ ОПЭРЫ.
Апошнія тры паказы.
26-га красавіка КАРМЭН.
27 га красавіка І. ПАЯЦЫ.
II. ВЯЛІКІ БАЛЕТНЫ КАНЦЭРТНЫ ДЫВЭРТЫСМЭНТ.
29-га красавіка апошняя гастроль ПІКАВАЯ ДАМА.
Хор 14 асоб, балет—12, аркэстр. Пачатак а 8 з паловай гадзіне ўвечары.
Білеты прадаюцца ў касе тэатру з 12 да 2 х гадзін дню і ад 5 да 9 гадзін увечары. Па калектыўных заўках—скідка 25 проц

Віцебскі гартоп абвяшчае пайнікам, што тэрмін водпуску дроў па ордэрах працягнуты да 15-га мая г. г.
388—2—1

Віцебская махорачная фабрыка даводзіць да ведама калгасаў і савгасаў, што ёю АДПУСКАЕЦЦА МАХОРАЧНЫ ПЫЛ для ўгнаеньня палёў і барацьбы з земляными шкоднікамі па 50 руб. за тону.
384—1—1

КАНФЭРЭНЦЫЯ БРЫГАДЗІРАЎ гаспадарча-разрахунковых брыгад
Сёньня, а 7й гадз увечары, у памяшканьні Палацу працы, пакой № 11 адбудзецца КАНФЭРЭНЦЫЯ БРЫГАДЗІРАЎ ГАСПРАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД ПА АБМЕНЕ ВОПЫТАМ.
На абвестцы дню: даклады лепшых брыгад фабрык імя К. Цэткін, „Сьцяг індустрыялізацыі“ акулярнай і „Дзьвіна“
Яўка брыгадзіраў прафоргаў, майстраў, ал бо інструктараў брыгад пля навікоў, ТНБістаў, заг. цэхаў, вытворчых сэктароў, ФЗМК абавязкова.
Білеты атрымаць у гарпрафсавеце, пакой № 21.
380—2—2 ГАРПРАФСАВЕТ.

ДЛЯ ВІЦЕБСКАЙ МАХОРАЧНАЙ ф брыкі ПАТРАБУЕЦЦА 5 чал. цыркулярщчыкаў для работы на цыркулярнай піле пры лесапільным цэху фабрыкі і 3 прафпажарнікі, адзін токар па мэталі 7 разр.
Зварочвацца па адрасе: Рэвалюцыйная вул., 8, упраўленьне махорачнай фабрыкі.
383—1—1

Патрабуюцца ТЭХНІКІ-СЬМЕТЧЫКІ.
Адрас: Лосьвіда, паштовае аддзяленьне Буяны, біафабрыка, кантора начальніка работ. Тэлефон: Буяны, біафабрыка.
381 3—3

Прадаецца кровельная асінавая шчэпа. За даведкамі зварочвацца: леспрамгас 8-я Сьвярдлова, № 6. Тэл. № 30.
373—3—2

Кіраўніцтва лазьнямі гэтым павядамляе насельніцтва гораду, што напярэдадні сьвяткаваньня 1 мая ўсе лазьні будуць працаваць у наступныя дні: 26, 27, 28, 29 і 30-га красавіка ўключна.
381—2—2

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Віцгарліт № 12. Друкарня „Камінтэрн“, Бальшавіцкая, 10.